# ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ

## СЦЯПАН ПРОХАРАВІЧ

Працаваў я ў Сібіры некалькі гадоў у сталярнай майстэрні з адным сібіраком, па паходжанні беларусам. Звалі яго Сцяпан Прохаравіч. Прозвішча ён меў – Мельнікаў. А які быў мастак: бондар, саннік, калёснік, рымар, паляўнічы, рыбак, шавец... І зверх усяго – музыка, скрыпач. Іграў ён на скрыпцы і сабе і людзям. Прасілі:

– Прыйдзі, Сцяпане, пайграй.

Хадзіў. А скрыпка – яшчэ бацькоўская, з Беларусі прывезеная...

І вось аднойчы трапілі мы ўдвух са Сцяпанам Прохаравічам у аварыю. Працавалі з ім пры невялічкай цыркулярнай піле ў сталярнай майстэрні. І вось паадрываліся нашы прымітыўныя мацункі, парэзала піла нам рукі: мне правую, садраўшы мяса з вялікага пальца, а яму – левую, паадразаўшы па адной фаланзе на пальцах. Заматалі мы свае рукі тым-сім ды пайшлі да хірурга. А хірург ледзь не адняла мне палец зусім. Сястра медыцынская дапамагла: маладая, дужая, сцягнула мяса з бакоў, а дакторка і прыхапіла іголкай... Так палец і ацалеў.

Сцяпану Прохаравічу ж і таго няма: зрабіла перавязку, кроў спыніла і ўсё.

– Зарасце, працаваць будзеце. Што для сталяра фаланга або і паўфалангі на левай руцэ? А каб уся рука, лягчэй?

Так яго суцяшала. А ён толькі падтаквае:

– Так, так, вашая праўда.

А калі мы выйшлі з бальніцы, азірнуўся ён, нікога блізка няма – стаў і... заплакаў...

Я жыў бліжэй ад бальніцы, чымсьці ён. Падумаў, што так ад болю ён. Запрашаю:

– Дарагі браце Сцяпане! Пойдзем да мяне, паляжыш, боль утаймуецца...

– Не, браток, гэты боль не ўтаймуецца навекі. Лепш бы мне пальцы на правай руцэ паабразала, чымсьці на левай...

Я адразу і не ўцяміў, кажу:

– Ды што ты, Сцяпане! Правая ж рука нам важней!

– Эх ты, брат! Ніяк зразумець не хочаш! Правай рукой я толькі смычок трымаю, а левай жа лады перабіраю. Ды які ж з мяне скрыпач будзе?

Тады я ўцяміў, што, маючы літаральна дваццаць спецыяльнасцяў, якімі ўладаў, бы прафесар, ён самай галоўнай лічыў дараваную яму ад прыроды – мастацкую, музычную. Яна, значыцца, прыносіла яму і радасць, і адпачынак, і асалоду. А самая вялікая асалода – усведамленне таго, што ты даеш радасць іншым людзям.

...Прайшло ўжо нямала часу, калі я развітаўся з тым сваім сябрам, сібірскім беларусам. Пабачыўшы адну жанчыну з таго далёкага паселішча, спытаў пра Сцяпана Прохаравіча:

– Як ён маецца, ці іграе на скрыпцы?

Адказала яна, уздыхнуўшы:

– Іграць-то ён іграе, але ўсё нешта не так...

Нездарма тады слёзы пакаціліся ў яго з вачэй...

*Паводле Уладзіміра Дубоўкі*
*зборнік “Пялёсткі” (1970–1973?)*